1702

обл. шлаг.

Государственное учреждение
"Национальный исторический архив Беларуси"

Фонд № 1702
Опись № 1

National Historical Archives of Belarus

1

Государственное учреждение
«Национальный исторический архив Беларуси»

Главный трибунал Великого Княжества Литовского (Главный Литовский трибунал) Речи Посполитой, город Троки Трокского повета Трокского воеводства, город Вильно Виленского повета Виленского воеводства, русские каденции в городе Минске Минского повета Минского воеводства и городе Новогрудке Новогрудского повета Новогрудского воеводства, с 1775 года - в городе Гродно Городенского повета Трокского воеводства, с 1793 года - Городенского воеводства Речи Посполитой

National Historical Archives of Belarus

**ФОНД № 1702**
**ОПИСЬ № 1**

Крайние даты дела 1617-1788 годы

21

Гісторыка-архіўная даведка

У 1581 г. па прыкладу Кароннага Трыбунала (1578 г.) пры каралі Стэфане Баторыі быў створаны Галоўны Літоўскі Трыбунал. Гэта быў вышэйшы апеляцыйны суд ВКЛ, рашэнні якога мелі сілу соймавых пастаноў і якія не меў права адмяніць сам кароль. Складаўся з суддзяў, якія штогод выбіраліся шляхтай на дэпутацкіх сойміках. Суддзі выбіралі маршалка — старшыню Трыбунала. Разглядаў скаргі на выракі і дэкрэты земскіх, гродскіх, падкаморскіх і іншых судоў, выконваў натарыяльныя абавязкі: завяраў тэстаменты, сведчыў дагаворы куплі-продажы маёнткаў, пазыкі і іншае. Пасяджэнні праводзіліся ў Троках, Вільні, Навагрудку, Мінску. Тэрміны пасяджэнняў называліся кадэнцыямі. У Вільні — Віленская кадэнцыя, у Навагрудку і Мінску — Руская кадэнцыя. Падраздзяляўся на два другія Трыбуналы — Скарбавы Трыбунал (або казённы) і Духоўны Трыбунал.

У працэсе ўдасканалення вопісу фонда ў 2008 г. у фонд паступілі 1 справа з ф. 1701 "Каронны Задворны асэсарскі суд", 1 справа з ф. 1774 "Навагрудскі земскі суд" і 1 справа з ф. 1776 "Ашмянскі земскі суд" згодна з актамі ад 6.05.2010. Выбылі 3 справы ў новастворany ф. 1953 "Галоўны Літоўскі суд".

Такім чынам у фондзе налічваецца 16 спраў разам з унесеным старым вопісам. Справы размешчаны па відах дакументаў у храналагічным парадку. Да вопісу складзена пераводная табліца.

Ясюк —

National Historical Archives of Belarus

2 3

Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі»

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК
дзяржаўнай установы
«Нацыянальны гістарычны архіў
Беларусі»
10.11.2010 № 3

ФОНД № 1702
ВОПІС № 1
спраў пастаяннага захоўвання
за 1617—1788 гг.

| № п/п | Індэкс справы ці нумар па старым вопісу | Заголовок справы | Дата (крайнія даты) справы | Колькасць аркушаў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | 1 | Актавая вячыстая і паточная кніга (Віленская кадэнцыя). | 26.06-20.08.1666 | 68 | Сігнатуры ВЦА: С.-5; Г.-5 Даўняя пагінацыя ВЦА: 1067-1134; Даўняя нумарацыя дак-ў №№[462]-496 |
| 2 | 3 | Актавая вячыстая кніга (Віленская кадэнцыя). | 28.04-27.08 1689 | 1382 | С.-32; Г.-31 №№ дак-ў 1-557 |
| 3 | ф.1776 воп. 1 спр.12 | Рэестр дакументаў да актавай вячыстай кнігі | 1705 | 47 | С.-51; Г.-49 Актавая кніга знаходзіцца ў Літоўскім ДГА. Рэестр дак-ў магчыма выпаў пад час перамяшчэнняў ВЦА у 1939, 1942 гг., а пасля вайны ў ЦДГА БССР у г. Гродна памылкова быў далучаны да фонда "Ашмянскі земскі суд" |
| 4 | ф.1744 воп. 1 спр.172 | Дэкрэталавая кніга (Наваградская кадэнцыя) *Кнігі дэкрэталаў (кароткіх выкладаў выракаў) знаходзіліся пры маршалку Трыбунала і з'яўляліся асновай для напісання адпраўчых лістоў. Па* | 09.- 4.12. 1642 | 236 | С.-7683; Г.-7726; Кніга захоўвалася ў XVII-XIX стст. у слонімскіх судовых установах, адкуль паступіла ў ВЦА, дзе была далучана да аддзела актавых кніг Слонімскага земскага суда. У ЦДГА БССР у 19… г. перададзена ў фонд |

National Historical Archives of Belarus

4

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | *сканчэнні кадэнцыі гэтыя кнігі не заўсёды захоўваліся ў Архіве Трыбунала, а часта заставаліся ў прыватным архіве маршалка* | | | "Наваградскі земскі суд" |
| 5 | 2 | Дэкрэталавая кніга (Наваградская кадэнцыя) *Маюцца дак-ты Наваградскага гродскага суда за 1717 г-1721 г. арк. 1134-1143 (№№569-[573])* | 23.09-16.12 1684 | 1143 | Г.-12522 У канцы XVII-XIX стст. кніга захоўвалася ў архіве Наваградскага Трыбунала, які знаходзіўся разам з архівам Наваградскага земскага суда. Абодва архівы цалкам згарэлі ў 1764 г., таму невядома, як захавалася гэтая кніга (магчыма, захоўвалася ў архіве Наваград. скага гродскага суда, бо ў канцы падшытыя дак-ты гэтай установы). У с.XIX ст. перададзена ў ВЦА, дзе была далучана да аддзела актавых вячыстых кніг Наваградскага земскага суда. У 1978 г. была далучана да фонда 1702 "Галоўны Трыбунал ВКЛ" |
| 6 | 14 | Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Мінску ад 6.11.1635 г. ліста продажы ад 26.05.1635 г.п. А.Я. Зверам і яго жонкай Зоф'яй Валадковічаўнай м-ка Сваятычы з фальв. Астроўчыцы і пушчай Машукі Наваградскага ваяв. (Запіс п. Звера Сваятыцкаму касцёлу) і м-ка Ліпаўцы Берасцейскага ваяв. панам Беліковічам (старабел.,старапольск.) | 6.11.1635 | 1 | пергамін 1635 г. |
| 7 | 5 | Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Наваградку дэкрэта ў справе праваслаўнага беларускага епіскапа Серафіёна Палхоўскага з Марціянам Умырукам-Запольскім аб крыўдах сялянам царкоўнага с. Смольскае Аршанскага пав. арк. 1-8; *Маецца фрагмент друкаванага* | 29.10.1701 | 9 | |

National Historical Archives of Belarus

A 5

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | *аркуша з невядомай працы Гарчакова пра праваслаўныя цэркvы і манастыры на мяжы XIX-XX стст., арк. 9* | | | |
| 8 | 6 | Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Мінску дэкрэта ў справе наваградскага кашталяна Антонія Навасельскага, апекуна дзяцей нябожчыка ўжвентскага старосты Дамініка Войны і іншых з віленскім ваяводам Казімірам Сапегам і яго сынам стольнікам ВКЛ Юрыем Сапегам і іншымі аб застаўным праве на м-к Заслаўе Мінскага ваяв. | 30.21.1713 | 44 | Паходзіць, верагодна, з архіваў роду Сапегаў. У XIX ст. захоўвалася ў архівах гродзенскіх дзяржаўных устаноў, адкуль трапіла ў ВЦА |
| 9 | 7 | [Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Вільні] дэкрэта ў справе полацкай ваяводзінай Дамінікавай Слушчынай Канстанцыі Падбярэзскай з мальбарскай ваяводзінай Канстанцыяй Слушчанкай Дэнгафавай і яе сынам каронным мечнікам Станіславам Дэнгафам і іншымі аб праве ўласнасці на спадчыну (Валожын, Стоўбцы і інш.) па нябожчыку надворным падскарбію ВКЛ Багуславу Слушку. | 6.08.1718 | 119 | С.- 5858, Г.- 5896 Старая пагінацыя: арк. 1-236 У XVIII-XIX стст. захоўвалася ў архіве Ашмянскага земскага суда, затым у архіве Ашмянскага ўезднага суда, адкуль паступіла ў ВЦА, дзе захоўвалася ў аддзеле Ашмянскага падкаморскага суда (дэкрэтавыя кнігі). |
| 10 | 8 | Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Мінску дэкрэта ў справе Сапегаў з крайчынай .ВКЛ Марыянай Радзівілавай, земскім падскарбіем ВКЛ Міхалам Казімірам Коцелам і іншымі аб праве ўласнасці на спадчыну па нябожчыку земскім падскарбіі ВКЛ Бенедыкту Паўлу Сапегу (графства Чарэя і іншыя маёнткі ў Ашмянскім пав.) | 8.01.1722 | 552 | С.- 11562, Г.- 11558 Копія XVIII ст.; 1 арк. без пагінацыі, з нататкай І.Спрогіса; Паходзіць з архіваў Сапегаў. У XIX ст. захоўвалася ў архіве Гродзенскай губернскай казённай палаты, адкуль паступіла ў ВЦА, дзе знаходзілася ў аддзеле Гродзенская губернія. |
| 11 | 9 | Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Мінску дэкрэта ў справе Матэуша і Юрыя Марцінкевічаў з Тэкляй Валадковічаўнай, старшай Мінскага кляштара базыльянак пры царкве Св.Тройцы, панамі Гарайнамі і іншымі аб грашовых су- | 29.11.1723 | 201 | Даўняя пагінацыя: XVIII ст. – 1-193; XIX ст. – 3233-3333. У 1-й палове XIX ст. у Вілейскім уездным судзе і, магчыма, у Мінскай палаце грамадзянскага суда вялася справа аб грашовых даўгах на ма- |

National Historical Archives of Belarus

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | мах, забяспечаных на кляштарных м-ках Грыневічы, Чарнаручча і Дзярэўніна Мінскага ваяв. | | | ёнтках Мінскага Траецкага кляштара базыльянак у Вілейскім пав. Да справы кляштар і іншыя асобы прадставілі свае дакты (архіў м-ка Грыневічы і інш.), у тым ліку і вышэй згаданы выпіс дэкрэта. Большая частка справаводства і архіў м-ка Грыневічы цяпер захоўваюцца ў НГАБ у г. Гродна ў ф. 1160 Вілейскі земскі павятовы суд і ф. 584 Вілейскі ўездны суд. |
| 12 | 10 | Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Навагрудку дэкрэта ў справе паноў Хадкевічаў з мсціслаўскім чашнікам Антоніем Сваткоўскім аб кантракце на выпрацоўку Восаўскай і Негінскай пушч *Маецца фрагмент падшытага дак-та, дзе згадв. Казімір Лускіна, Ігнацій Любашчынскі і іншыя, м-к Пурплева (XVIII ст.), арк. 47-48* | 1.02.1771 | 49 | Маецца нататка губернскай камісіі па правецы актавых і метрычных кніг аб пранумараванні аркушаў. 1835 г. арк. 49. Верагодна, у XIX ст. захоўвалася ў архівах Мінскіх судовых устаноў, а потым у ВЦА. Старая вокладка не захавалася і іншых адзнак няма. |
| 13 | ф.1701 воп. 1 спр.2 | Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Вільні дэкрэта ў справе любоніцкіх і бахтынскіх старостаў Паўла і Альжбеты з Заранкаў Лэнскіх з смаленскім падчашым Станіславам Пуцятам і Янам Драбышэўскім аб праве ўласнасці на пушчу і землі Прысынкаўскія Мінскага ваяв., м-к Дворац Слонімскага пав. і па іншых актаратах. | 3.08.1785 | 103 | Пагінацыя XVIII ст.: 1-204 |
| 14 | 4 | Калекцыя дакументаў па гісторыі паселішчаў і шляхты Мінскага ваяв., Ваўкавыскага і іншых паветаў (старабел.,старапольск., лацін.) | 1617-1737 | 27 | |
| 15 | 15 | Калекцыя дакументаў па розных справах паноў Хлюдзінскіх, па Лідскаму, Аршанскаму паветах і інш. (старабел.,старапольск., лацін.) | 1666-1788 | | Верагодна, паходзяць са збораў аддзела рукапісаў былой Віленскай публічнай бібліятэкі |

National Historical Archives of Belarus

67

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 16 | | Вопіс да ўдасканалення | | | |

У дадзены вопіс унесена 16 (шаснаццаць) справ

Вопіс склаў
вядучы палеограф
аддзела старажытных актаў
06.05.2010
Г.М. Брэгер

Заг. аддзела старажытных актаў………………………………В.У. Бабкова
06.05.2010

National Historical Archives of Belarus

Пераводная табліца да ф. 1702

| Новы нумар | Стары нумар |
|---|---|
| 1 | 1 |
| 2 | 3 |
| 3 | ф.1776, воп. 1, спр. 12 |
| 4 | ф.1744, воп. 1, спр. 172 |
| 5 | 2 |
| 6 | 14 |
| 7 | 5 |
| 8 | 6 |
| 9 | 7 |
| 10 | 8 |
| 11 | 9 |
| 12 | 10 |
| 13 | ф.1701, воп.1, спр. 2 |
| 14 | 4 |
| 15 | 15 |
| | |

National Historical Archives of Belarus

ЛИСТ-ЗАВЕРИТЕЛЬ ОПИСИ ф. 1702-1

В деле подшито и пронумеровано 8 (Восемь) листов

в том числе:
литерные номера
пропущенные номера
+ листов внутренней описи

Архивист Н.Г.Белогурцева

02-09-2013

National Historical Archives of Belarus